**ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»**

**ВОСЕНЬ – АПОШНЯЯ, САМАЯ ЦУДОЎНАЯ ЎСМЕШКА ГОДУ**
***УІЛЬЯМ К. БРАЙАНТ***



**Фотаздымак канцэртнай праграмы, прысвечанай Дню маці**

## НАСТАЎНІК — ГЭТА НАЗАЎСЁДЫ

Першая нядзеля кастрычніка ў Беларусі — **ДЗЕНЬ НАСТАЎНІКА.** Для кожнага прадстаўніка прафесіі, звязанай з навучаннем, гэтае свята — адзін з найбольш значных і ўрачыстых.



**Настаўнік - гэта той чалавек, які лёгка можа зрабіць усё складанае лёгкім.**
***Р. Эмерсан***




У сярэдзіне восені — 14 кастрычніка – Беларусь адзначае **ДЗЕНЬ МАЦІ**, пачынаючы з 1996 года. Дата святкавання прымеркавана да вялікага праваслаўнага свята — Пакрова Прасвятой Багародзіцы.

**ХТО СКАЗАЎ, ШТО АНЁЛАЎ НА ЗЯМЛІ НЕ БЫВАЕ? ГЭТА Ж НАШЫ МІЛЫЯ МАТУЛІ!**

## НАДЗЕЙНЫ ТЫЛ І АПОРА СЯМ'І – З ДНЁМ БАЦЬКІ



Сёлета ў Беларусі ўпершыню праходзіць бацькоўскі тыдзень, які пачаўся 14 кастрычніка ў Дзень маці і скончыцца 21 кастрычніка ў Дзень бацькі. І для тых, хто рыхтуецца адсвяткаваць Дзень бацькі, нагадаем - сёлета ён выпадае на пятніцу.

*У ГЭТЫМ ВЫПУСКУ*

| | | |
|---|---|---|
| **ДЗЕНЬ МАЦІ**<br>*Мерапрыемствы, прысвечаныя Дню маці* | **ДЗЕНЬ БАЦЬКІ**<br>*Святкаванне Дня бацькі!* | **ДЗЕНЬ НАСТАЎНІКА**<br>*Канцэртная праграма* |

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

## ТЫ НАСІЛА ПАД СЭРЦАМ МЯНЕ, А ЦЯПЕР Я НАШУ ЦЯБЕ У СЭРЦЫ, МАМА.

**ЛЕАНЕЦ АНАСТАСІЯ,**

**8 КЛАС**

**Першая нядзеля кастрычніка ў Беларусі — гэта Дзень настаўніка.**

Для кожнага прадстаўніка прафесіі, звязанай з навучаннем, гэтае свята — адно з найбольш значных і ўрачыстых.

Дзень настаўніка — гэта не проста дзень святкавання, гэта магчымасць выказаць падзяку ўсім тым, хто робіць наш свет багацейшым на веды і дапамагае нам стаць лепш.

Настаўнік — адна з самых цяжкіх і адказных прафесій. Прафесія настаўніка сярод іншых вылучаецца асаблівай адказнасцю і маштабнасцю.








**Фатаздымкі канцэртнай праграмы, прысвечанай Дню настаўніка**

Педагог знаёміць сваіх вучняў з навуковымі дасягненнямі чалавецтва і вучыць іх здабываць веды самастойна.

Дзень настаўніка – цёплае і кранальнае свята.

Гэта дзень, калі кожны спяшаецца аддаць даніну павагі тым педагогам, якія ўклалі ў нас часцінку сябе і сваіх ведаў. Гэта дзень, калі мы віншуем і дзякуем тым, хто сёння вучыць і настаўляе дзяцей і моладзь.

Так як свята праводзіцца ў нядзелю, у школах ён святкуецца на напярэдадні - у пятніцу. У гэты дзень у нашай школе прайшоў канцэрт, прысвечаны Дню настаўніка.

Ад усяго сэрца дзякуем за працу, веды, клопат і разуменне! Хочам пажадаць Вам здароўя, цярпення, сіл, міру,



дабрабыту. А таксама нястомнага пошуку ісціны, узаемаразумення ў калектыве і ўдзячных, дапытлівых вучняў!



З Днём настаўніка!

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»




# ДЗЕНЬ МАЦІ Ў НАШАЙ ШКОЛЕ

ГРЫКЕНЬ АЛЕНА,

8 КЛАС

**14 КАСТРЫЧНІКА – СВЯТА САМАГА БЛІЗКАГА І РОДНАГА НАМ ЧАЛАВЕКА, ЯКІ ПАДАРЫЎ ЖЫЦЦЁ.**

Дзень маці святкуюць усе жанчыны, якія спазналі радасць мацярынства або якія толькі рыхтуюцца стаць мамамі. Урачыстыя мерапрыемствы праходзяць на працягу цэлага тыдня, а не аднаго дня.

Сям'я – гэта не толькі каштоўнасць, але і сацыяльны устой грамадства. Важнае значэнне ў яе станаўленні і існаванні маюць маці. Ім адводзіцца стваральная роля, яны закладваюць жыццёвыя арыенціры дзецям, а гэта, у сваю чаргу, умацоўвае прэстыж сям'і і вядзе да паўнавартаснага развіцця грамадства і дзяржавы.

*Я слаўлю мамы светлае імя –*
*Пяшчотнае, нібыта яблынь квецень.*
*Матулінага сэрца цеплыня*
*Нас саграваe лепш за ўсё на свеце.*









ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

## *21 КАСТРЫЧНІКА – ДЗЕНЬ БАЦЬКІ*

**САВЕНОК ГАННА,**

**9 КЛАС**

Сёлета ў Беларусі ўпершыню праходзіць бацькоўскі тыдзень, які пачаўся 14 кастрычніка ў Дзень маці і скончыцца 21 кастрычніка ў Дзень бацькі. І для тых, хто рыхтуецца адсвяткаваць Дзень бацькі, нагадаем - сёлета ён выпадае на пятніцу.

### Дзень бацькі ў Беларусі, гісторыя свята



Ініцыятыва аб заснаванні Дня бацькі прагучала падчас звароту прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу 28 студзеня 2022 года. Аляксандр Лукашэнка сказаў: - *Дзень жанчын, Дзень маці - мы, мужыкі, тут бегаем, скачам, са скуры прэч лезем, стараемся вам дагадзіць. А калі вы нам імкнецеся дагадзіць, я, сапраўды кажучы, і не ведаю.*

І вось указам прэзідэнта ад 9 чэрвеня 2022 года было ўстаноўлена новае свята – Дзень бацькі.

### Традыцыі на Дзень бацькі ў Беларусі

*Дата 21 кастрычніка ўзнікла не выпадкова. 14 кастрычніка адзначаецца Дзень маці. З 14 па 21 кастрычніка з'явілася ідэя арганізаваць бацькоўскі тыдзень.*

Гэтымі днямі праводзяцца розныя мерапрыемствы, прысвечаныя сям'і, мацярынству і бацькоўству, дабрачынныя акцыі для дзяцей.

14 кастрычніка на вуліцах беларускіх гарадоў можна было ўбачыць шмат людзей з кветкамі, якія спяшаліся павіншаваць сваіх маці і бабуль. Цікава, што будуць дарыць бацькам і дзядам?



### Як адзначаюць Дзень бацькі у свеце?

Нагадаем, што ў Расіі Дзень бацькі святкуецца ў трэцюю нядзелю кастрычніка, сёлета ён прайшоў 16 кастрычніка. А калі і як бацькоў віншуюць за мяжой? Наогул традыцыя была закладзена ў 1909 годзе ў амерыканскім горадзе Спокан, штат Вашынгтон. На царкоўнай службе з нагоды Дня маці мясцовая жыхарка Санора Луіза Смарт Дод задумалася - чаму няма падобнага свята для бацькоў. Маці самой Санары памерла пасля нараджэння шостага дзіцяці. Дзяцей выхоўваў бацька, Уільям Джэксан Смарт, ветэран Грамадзянскай вайны. Ён стаў для сваіх дзяцей любячым і клапатлівым бацькам і прыкладам для пераймання. Так свята з'явілася ў ЗША.

У свеце Дзень бацькі адзначаюць амаль у 60 краінах свету. У палове з іх святкуюць як і ў ЗША - трэцюю нядзелю чэрвеня. А, напрыклад, у Італіі, Іспаніі і Партугаліі - 19 сакавіка.






ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»



ТЫДЗЕНЬ БАЦОКОЎСКАЙ ЛЮБОВІ!

# Навіны дзіцячага сада

ЛЕАНЕЦ АНАСТАСІЯ, 8 КЛАС

У дзяцічым садочку прайшлі мерапрыемствы у рамках дзіцячых праектаў, прысвечаных тыдню бацькоўскай любові „Любімай матулі спяваем мы песню," і "Віншуем нашых татаў".

Тыдзень бацькоўскай любові прымеркаваны падтрымцы сямейных каштоўнасцей і стварэнню атмасферы ўзаемаразумення і падзякі да тых, хто дорыць нам жыццё.

## У ДЗЯРЖАЎНАЙ УСТАНОВЕ АДУКАЦЫІ “ГРЫЧЫНСКАЯ БАЗАВАЯ ШКОЛА” ВЫХАВАНЦЫ ДІЦЯЧАГА САДА ПАДРЫХТАВАЛІ ВІДЭА-ВІНШАВАННІ ДЛЯ СВАІХ БАЦЬКОЎ

Бацькоўская любоў - наймацнейшая, бескарыслівая, далікатная, трапяткая, велізарная, бясконцая. Шчаслівыя тыя людзі, якім удалося выпрабаваць гэтае пачуццё. Ніхто на белым свеце не хвалюецца так за дзяцей, як мама і тата. Колькі б ні было чалавеку гадоў, два ці сорак гадоў, для мамы ён застаецца заўсёды дзіцем. Толькі бацькі шчыра будуць перажываць, верыць, спадзяецца, моліцца за дабрабыт свайго дзіцяці.
А выхаванцы нашага дзіцячага сада вельмі шмат папрацавалі над віншаваннямі для сваіх любімых бацькоў: відэа-віншаванні, песні, вершы, паштоўкі, вырабы з каляровай паперы і многае іншае.





# БЯСПЕЧНЫЯ ПАВОДЗІНЫ. НЕБЯСПЕКА ЛЁДУ

